**Абскарджанне адказаў на звароты**

**Паважаны наведвальнік!**

Парадак абскарджання адказаў на звароты рэгулюецца артыкулам 20 Закона Рэспублікі Беларусь «Аб зваротах грамадзян і юрыдычных асоб» (далей – Закон). Адказ арганізацыі на зварот або рашэнне аб пакіданні звароту без разгляду па сутнасці можа быць абскарджаны у вышэйстаячую арганізацыю. Вышэйстаячая арганізацыя пры паступленні такой скаргі правярае звесткі, якия у ёй змяшчаюцца, і пры наяўнасці падстаў для станоўчага вырашэння выкладзеных у звароце пытанняў разглядае зварот па сутнасці або выдае адпаведным арганізацыям абавязковае для выканання прадпісанне аб належным рашэнні гэтых пытанняў, пра што паведамляе заяўніку. Арганізацыя, якая атрымала такое прадпісанне, павінна выканаць яго ў названы ў прадпісанні тэрмін, але не пазней за адзін месяц і на працягу трох дзён паведаміць пра гэта ў вышэйстаячую арганізацыю, а таксама паведаміць заяўніку. Адказ арганізацыі на зварот або рашэнне аб пакіданні звароту без разгляду па сутнасці пасля абскарджання ў вышэйстаячую арганізацыю могуць быць абскарджаны ў суд у парадку, устаноўленым заканадаўствам.

Адказ на скаргу ў вышэйстаячую арганізацыю можа быць абскарджаны ў суд, калі пры разглядзе гэтай скаргі прынята новае рашэнне, якое адносіцца да кампетэнцыі адпаведнай вышэйстаячай арганізацыі. Разгляд вышэйстаячай арганізацыяй скаргі па сутнасці ажыццяўляецца ў парадку і тэрміны, устаноўленыя Законам. Адказ на зварот або рашэнне аб пакіданні звароту без разгляду па сутнасці арганізацыі, якая не мае вышэйстаячай арганізацыі, а таксама індывідуальнага прадпрымальніка могуць быць абскарджаны ў суд у парадку, устаноўленым заканадаўствам.

**Парадак абскарджання адказаў Міністэрства працы і сацыяльнай абароны Рэспублікі Беларусь**

Адказ Міністэрства працы і сацыяльнай абароны Рэспублікі Беларусь на зварот заяўніка можа быць абскарджаны ў судовым парадку.